## АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ ПА ВЫКАНАННЮ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ДОЎГАТЭРМІНОВЫХ МЭТАВЫХ ПРАГРАМ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ў 2000 г.

Аналізуючы ход выканання 20-ці рэгіянальных мэтавых праграм у 2000 г., трэба адзначыць, што запланаваныя ў іх мерапрыемствы ў асноўным выкананы. Сумеснае фінанасаванне з абласнога і мясцовых бюджэтаў, у першую чаргу, было накіравана на ўдасканальванне структуры профільных тыпаў устаноў культуры, умацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, а таксама асобных майстэрань, гурткоў, на далейшае ўсебаковае развіццё народнай творчасці.

Так, па выніках рэгіянальнай праграмы ў Нясвіжскім раёне быў адчынены Міцкавіцкі сельскі Дом рамёстваў з дзіцячымі гурткамі па саломапляценню і вышыўцы, на базе Казлоўскага і Юшавіцкага сельскіх клубаў пачалася работа па збору старадаўніх прылад для ткацтва, прадзення, апрацоўкі сыравіны. Абсталёўваюцца «беларускія хаткі», дзе ў перспектыве дзеці і падлеткі таксама будуць навучацца традыцыйным рамёствам. У Анош-

каўскай дзіцячай школе мастацтваў створаны гурток разьбы па дрэву. За кошт сумесных сродкаў былі набыты ганчарны круг і муфельная печ, ткацкія станкі, ніткі, адрамантавана памяшканне выставачнага салона ў г.Нясвіжы.

У Барысаўскім раёне пачаў працаваць Лаўніцкі сельскі Дом фальклору. У Салігорскім раёне адкрыліся майстэрні па ткацтву пры Хорастаўскім СДК, Махнавіцкім СК. Для майстэрні Вялікарожанскага СДК былі набыты ткацкі станок, ніткі, а ў майстэрню пры Доўгаўскім СДК — неабходная сыравіна для гурткоў па саломаплаценню, выпальванню, макрамэ. Большая частка сродкаў па праграме пайшла на набыццё будынка для раённага Дома рамёстваў у г.п.Старобін.

У Лагойскім раёне дзякуючы намаганням райвыканкома, аддзела культуры, іншых арганізацый была праведзена рэканструкцыя былога гаража, і падчас правядзення III абласнога свята-конкурсу ганчароў «Гліняны звон», у якім удзельнічалі 52 майстры з 14 рэгіёнаў Міншчыны, была адчынена ганчарная майстэрня.

У Крупскім раёне на базе РЦК створаны гурткі па вышыўцы і абрэзку, у Доме культуры мікрараёна Крупкі-2 пачаў працаваць гурток разьбы па дрэву, а ў 5-ці сельскіх клубах — па саломапляценню. Для гэтых гурткоў была набыта сыравіна і інструменты. Праведзена раённае свята майстроў, плануецца выданне зборніка аб народнай творчасці Крупшчыны «Ручаіны».

За кошт фінансавання рэгіянальных праграм была падмацавана матэрыяльна-тэхнічная база і ў раней адчыненых установах вобласці. Сярод іх — Крывіцкі раённы цэнтр рамёстваў Мядзельскага раёна, у якім сёння працуе майстэрня па апрацоўцы драўніны і 6 гурткоў па традыцыйных рамёствах, дзе з навучэнцамі займаецца 5 штатных майстроў. Для яго развіцця былі набыты некаторыя інструменты і сыравіна. На баланс цэнтра рамёстваў перададзены былы цэх керамікі, рэканструкцыю якога плануецца пачаць у 2001 г.

У Марацкім сельскім Доме майстроў Клецкага раёна працягвалі працаваць 6 дзіцячых гурткоў па розным рамёствам, а таксама гурток ткацтва пры раённым гісторы-

ка-краязнаўчым музеі. У Янавіцкім СДК у 2000 г. былі створаны музей народнага побыту з майстэрняй па ткацтву. З'явілася новая форма работы па прапагандзе народнай творчасці — фестываль-конкурс «Добрых спраў майстры», які на працягу 2000 г. прайшоў па ўсіх 12-ці сельскіх Саветах і ў ім прынялі ўдзел майстры амаль з кожнай вёскі. Фінал адбыўся ў г.Клецку ў канцы года.

У рамках рэгіянальнай праграмы абласнога музея Ф.Э.Дзяржынскага «Вяртанне да вытокаў» плённа працавалі пры музейным цэнтры рамёстваў майстэрні па ганчарству, ткацтву, маляванню, у якіх займаецца 45 навучэнцаў пад кіраўніцтвам народных майстроў — членаў Беларускага саюза майстроў. Згодна з рашэннем Івянецкага пасялковага Савета ад 14.03.2000 г. музею выдзелены зямельны ўчастак плошчай 0,9 га, дзе знаходзяцца пабудовы помнікаў XX ст. Пачынаючы з 2001 г. у іх пачне ствараецца база для майстэрань па мастацкай апрацоўцы драўніны і лозапляценню, адкрыцця этнаграфічнай экспазіцыі вырабаў з дрэва, прылад працы, а таксама музея местачковага побыту з карчмой.

У мэтах эстэтызацыі асяроддзя была добраўпарадкавана тэрыторыя і па-мастацку аформлены памяшканні раённага Дома рамёстваў в.Ізбіно Вілейскага раёна. Сёння ў ім працуюць майстэрні разьбы па дрэву, лозапляценню, вышыўцы, коўцы жалеза. У ліпені мінулага года выстаўка вырабаў кіраўнікоў і навучэнцаў цэнтра рамёстваў адбылася ў выставачнай зале г.Вілейкі, а потым на абласным кірмашы «Маладзечна-2000».

Стварэнне адпаведных умоў для працы ў рамках мэтавых праграм спрыяла адкрыццю новых гурткоў і ў іншых рэгіёнах: у Капыльскім раёне — па вышыўцы пры Харытонаўскім, Садавіцкім, Кіявіцкім СК; у Смалявіцкім раёне — па вырабу беларускай цацкі пры гарадскім Доме культуры, а па роспісу па тканіне — пры Забалацкім СДК; у Валожынскім раёне — па вышыўцы і саломапляценню пры Гарадзечанскім Доме майстроў (на базе Лоскаўскай і Гародзькаўскай сярэдніх школ) і г.д.

У рамках рэгіянальных праграм у 2000 г. паспяхова прайшлі Тыдзень традыцыйнага мастацтва «Крыніцы

творчасці народнай» (Валожынскі раён), дні культуры сельскіх Саветаў у г. Капылі.

У Нясвіжскім раёне ў мінулым годзе быў створаны клуб майстроў і праведзена першае свята-конкурс рэзчыкаў па дрэву «Разца дзівосныя тварэнні», а ў Уздзенскім раёне адбыўся першы раённы конкурс вышывальшчыц «Матчын ручнік». Раённы цэнтр рамёстваў Маладзечанскага раёна арганізаваў больш за 20 выставак народных майстроў.

Практычна па ўсіх 16 праграмах па падтрымцы мастацтва ў 2000 г. працягвалася далейшая работа метадычных службаў па вывучэнню рэгіянальных асаблівасцей сваіх рэгіёнаў. Цікава ў гэтым напрамку працавалі ў рамках праграмы «Спадчына» ўстановы культуры Бярэзінскага раёна: праведзены 2 фальклорныя экспедыцыі, па выніках якіх выдадзены чарговы зборнік «Фальклорная скарбонка Бярэзінскай зямлі», раённы семінар «Праблемы адраджэння традыцыйнай культуры сучаснай вёскі»; трэці год у раёне праводзіцца конкурс сярод сельскіх клубных устаноў на лепшую фальклорна-абрадавую праграму і г.д.

Значны ўклад ва ўкараненне рэгіянальных мэтавых праграм, прапаганду народнай творчасці Мінскай вобласці ўносіць абласны цэнтр народнай творчасці. У 2000 г. у Старадарожскім раёне адбылося I абласное свята-конкурс ткачых «Матчыны кросны», у якім прынялі ўдзел 28 ткачых з 13-ці рэгіёнаў вобласці і г.Салігорска; на базе Маладзечанскага музычнага вучылішча імя Агінскага прайшло I свята-конкурс па выцінанцы «Папяровыя карункі». Па яго выніках 10 лепшых майстроў прынялі ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе «Ажурныя ўзоры», з іх 3 майстры атрымалі дыпломы пераможцаў.

У Барысаўскім, Уздзенскім раёнах прайшлі абласныя семінары-практыкумы дырэктараў РДК, РЦК, ГпДК, ГДК, метадычных службаў, падчас якіх удзельнікі ўбачылі станоўчы вопыт і канкрэтныя вынікі мэтавых праграм па падтрымцы народнай творчасці гэтых рэгіёнаў.

У выставачнай зале АЦНТ на працягу 2000 г. адбылося 6 выставак народнай творчасці.

Шмат народных майстроў і фальклорных калектываў прынялі ўдзел ва ўпершыню праведзеных абласных кірмашах у гг. Салігорску, Маладзечне, Барысаве, Жодзіне.

На вырашэнне праблем моладзі, арганізацыю вольнага часу праз традыцыйныя , папулярныя і эксперыментальныя формы работы з гэтай катэгорыяй насельніцтва працягвалі дзейнічаць мэтавыя праграмы г.г. Слуцка, Жодзіна, Заслаўя. 2000 год стаў для іх завяршаючым.

Па выніках доўгатэрміновай гарадской праграмы «Моладзь і культура» аддзела культуры і аддзела па справах моладзі г.Слуцка значна ўмацавана матэрыяльна-тэхнічная база гарадскога Дома культуры і яго філіяла — цэнтра вольнага часу, маладзёжнага цэнтра, гарадской бібліятэкі (рамонты, набыццё сучаснай гукаўзмацняльнай і асвятляльнай апаратуры, трох камп'ютэраў, касцюмаў для мастацкай самадзейнасці і г.д.). Акрамя таго, паспяхова працягвалі выконвацца 4 падпраграмы: «Цэнтр-сам», «Інтэлект», «Маладая сям'я», «Галерэя», накіраваныя на развіццё творчага патэнцыялу, падтрымку таленавітай моладзі. Работа над праграмай садзейнічала актывізацыі ўсіх структур сацыяльнай і культурнай сферы горада ў выхаваўчай і культурна-масавай рабоце з моладдзю, павышэнню прэстыжу ўстаноў культуры.

Падчас выканання праграмы «Крыніцы духоўнасці» Маладзечанскай гарадской бібліятэкай быў адкрыты аддзел мастацтва з фондам каля 5 тыс. экз.; стала больш сістэмнай выставачная дзейнасць, ідзе работа па стварэнню мастацкай галерэі; развіваюцца новыя формы масавых мерапрыемстваў, павялічваецца колькасць клубаў і аматарскіх аб'яднанняў пры бібліятэках; створаны экалагічны клуб «Вандроўнік» у філіяле № 3, відэалекторый у ЦБ, 4 клубы ў бібліятэцы «Верасок».

Жодзінская гарадская бібліятэка, выконваючы праграму «Адораная моладзь і творчая інтэлігенцыя», правяла шэраг маркетынгавых даследаванняў па вывучэнню чытацкага попыту. Гэта дало магчымасць арганізаваць інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі, распрацаваць пералік відаў паслуг па абслугоўванню адоранай моладзі і творчай інтэлігенцыі.

На жаль, у межах рэгіянальнай маладзёжнай праграмы «Культура і моладзь» г.Заслаўя не адбылося адкрыццё маладзёжнага кафэ пры гарадскім ДК «Світанак» (недахоп фінансавых сродкаў). Разам з тым, культурна-масавыя мерапрыемствы, розныя культуралагічныя маладзёжныя акцыі па 4-х падпраграмах былі, у асноўным, выкананы і спрыялі аб'яднанню творчых сіл горада.

Для далейшага развіцця маладзёжных праграм, арганізацыі вольнага часу моладзі, выкарыстання ў практыцы работы ўстаноў культуры сучасных форм маладзёжнага адпачынку распрацавана абласная праграма «Дыскатэка» на 2001—2004 гг.

Згодна з пастановай пашыранай калегіі ўпраўлення культуры ад 26 снежня 1999 г., на працягу 2000 г. сумесна з адзеламі культуры райвыканкомаў праводзілася работа па распрацоўцы абласной праграмы па захаванню і развіццю традыцыйнай мастацкай культуры. Рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 26.12.2000 № 927 былі зацверджаны «Мерапрыемствы па захаванню і развіццю традыцыйнай мастацкай культуры Мінскай вобласці на 2001—2005 гады», што з'явілася сукупным вынікам дзейнасці рэгіянальных мэтавых праграм Мінскай вобласці на працягу 1994—2000 гг.

*Г.І.Лінская, галоўны спецыяліст*
*упраўлення культуры*
*Мінскага аблвыканкома*